УДК 316.77,008

КУЛЬТУРА ЯК ДЗЕЯСЛОЎ: ПРЫКЛАД ГРАМАТЫЧНАЙ МЕТАФАРЫ

А. Д. КРЫВАЛАП[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Анатацыя. Разгледжваецца магчымасць разумення культуры як дзеяслова, а не як назоўніка. Ідэя культуры як дзеяслова выкарыстоўваецца ў якасці граматычнай метафары, што дазваляе па-іншаму паглядзець на магчымыя падыходы да вызначэння культуры: перайсці ад статыкі да дзейнасці, ад спадчыны да працэсаў, ад артэфактаў да практыкі іх стварэння. Паказваецца магчымасць пераасэнсавання слова «культура» як дзеяслова ў адпаведнасці з поглядамі часоў Антычнасці. У якасці тэарэтычнага падмурка выкарыстоўваюцца працы такіх даследчыкаў, як У. Л. Абушенка, Г. Зімель, Катон, І. Я. Мацэвіч-Духан і Б. В. Стрыт. Тэкст не пра часціны мовы, а пра магчымасць пераасэнсавання ў межах дыскурса культуралогіі як навуковай дысцыпліны. Разгляданне культуры як дзеяслова з'яўляецца пошукам тлумачэння ўласных дзеянняў. Ідэнтычнасць даследуецца не як ступень адпаведнасці самому сабе ці нейкім нарматыўным узорам у мінулым, а як паслядоўная серыя адказаў на шырокі спектр пытанняў.

Ключавыя словы: культурная ідэнтычнасць; практыка; праксіс; тыпалагізацыя культуры; дзейнасць.

Образец цитирования:
Крывалап АД. Культура як дзеяслоў: прыклад граматычнай метафары. *Человек в социокультурном измерении*. 2026;1–2:53–59.
EDN: SUKKFY

For citation:
Krivolap AD. Culture as a verb: the case of grammatical metaphor. *Human in the Socio-Cultural Dimension.* 2026;1–2: 53–59. Belarusian.
EDN: SUKKFY

Автор:
Алексей Дмитриевич Криволап – кандидат культурологии; доцент кафедры культурологии факультета социокультурных коммуникаций.

Author:
Alexei D. Krivolap, PhD (cultural studies); associate professor at the department of cultural studies, faculty of social and cultural communications.
email2krivolap@gmail.com
https://orcid.org/0000-0002-4478-4930

CC BY NC

Человек в социокультурном измерении. 2026;1–2:53–59
Human in the Socio-Cultural Dimension. 2026;1–2:53–59

КУЛЬТУРА КАК ГЛАГОЛ: ПРИМЕР ГРАММАТИЧЕСКОЙ МЕТАФОРЫ

А. Д. КРИВОЛАП[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Аннотация. Рассматривается возможность понимания культуры как глагола, а не как существительного. Идея культуры как глагола опирается на грамматическую метафору, которая позволяет взглянуть на возможные подходы к определению культуры по-новому: перейти от статики к деятельности, от наследия к процессам, от артефактов к практике их создания. Показывается возможность переосмысления слова «культура» как глагола в соответствии со взглядами времен Античности. В качестве теоретической основы используются работы таких исследователей, как В. Л. Абушенко, Г. Зиммель, Катон, И. Я. Мацевич-Духан и Б. В. Стрит. Текст посвящен не частям речи, а возможности переосмысления в рамках дискурса культурологии как научной дисциплины. Рассмотрение культуры как глагола является поиском объяснения собственных действий. Идентичность исследуется не как степень соответствия самому себе или какому-либо нормативному образцу прошлого, а как последовательная серия практических ответов на широкий круг вопросов.

Ключевые слова: культурная идентичность; практика; праксис; типлогизация культуры; деятельность.

CULTURE AS A VERB: THE CASE OF GRAMMATICAL METAPHOR

A. D. KRIVOLAP[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

Abstract. The article considers the possibility of understanding culture as a verb instead of a noun. The idea of culture as a verb is used as a grammatical metaphor, which allows us to look at possible approaches to defining culture in a different way: to move from statics to activity, from heritage to processes, from artifacts to the practice of their creation. The article shows the possibility of rethinking the word «culture» as a verb in accordance with the views of the times of Antiquity. The works of such researchers as V. L. Abushenka, G. Simmel, Katon, I. Ya. Matsevich-Dukhan, and B. V. Street are used as a theoretical foundation. This text is not about parts of speech, but about the possibility of rethinking within the framework of the discourse of cultural studies as a scientific discipline. Studying culture as a verb is a search for an explanation for one's own actions. Identity is explored not as a degree of conformity to oneself or to some normative pattern in the past, but as a consistent series of answers to a wide range of questions.

Keywords: cultural identity; practice; praxis; typology of culture; activity.

Уводзіны

Падчас выкладання культуралогіі кожны год узнікаюць адны і тыя ж пытанні, звязаныя з вызначэннем культуры і разуменнем таго, што вывучае культуралогія як акадэмічная дысцыпліна. У такім кантэксце абавязкова ўзгадваецца асоба Марка Порцыя Катона Старэйшага і яго тэкст «Земляробства» («De Agri Cultura»). Наяўнасць слова «cultura» ў лацінскай назве не павінна ўводзіць у зман – гэта тэкст пра апрацоўку зямлі, парады будучым гаспадарам [1]. Можна сказаць, што з гэтага трактату і пачынаецца непаразуменне адносна таго, чым з'яўлялася культура ў Антычнасці і чым яна можа быць сёння.

У трактаце дзеяча няма вызначэння культуры, але падрабязна разглядаюцца разнастайныя расліны, прыдатныя для выкарыстання ў сельскагаспадарчай дзейнасці, той самай, якая можа быць названа культывацыяй. Культура вывучае, як ўвесці ў сельскагаспадарчы абыход ці «акультурыць» дзікія расліны з дапамогай прышчэпаў, адводак. Ці, іншымі словамі, як развіць і падтрымаць у дзікай прыродзе тыя якасці раслін, што найбольш цікавяць чалавека. Магчыма, што менавіта гэта метафарычнае разуменне з'яўляецца разгляданнем культуры як чагосьці, што можа спрыяць развіццю і фарміраванню нейкіх новых здольнасцей на падставе прыроднага таленту пад пільным кантролем гаспадара. Зразумела, што ў антычным тэксце няма і не можа быць разумення генетыкі. Аднак важнасць гэтага трактату для культуралогіі заключаецца менавіта ў тым, што культурныя з'явы ствараюцца на падмурку прыродных, натуральных. Культура выступае прыродай, якая не можа быць цалкам адарванай ад сваіх дзікіх

каранёў, але пры гэтым можа трансфармавацца да непазнавальнасці. Магчыма, што з гэтага тэксту пачынаецца вечная дыскусія аб стасунках культуры і прыроды.

У пачатку XX ст. Г. Зімель, разважаючы пра сутнасць культуры, выкарыстаў метафару, апісаўшы працэс культывацыі на прыкладзе грушы. З дзічкі з дапамогай прышчэпа атрымліваюць пэўны гатунак: «Груша лічыцца культываванай, паколькі праца садоўніка развівае арганічныя схільнасці, дрымотныя магчымасці яе прыроднай формы, паколькі яна прыводзіць да поўнага адкрыцця ўласнай прыроды дрэва»[1] [2, с. 476]. Але без «тэлеалагічнага ўмяшання», як адзначае Г. Зімель, ці, іншымі словамі, без знешняга ўплыву ў выглядзе актыўных дзеянняў садоўніка, гэтыя схільнасці не прачнуцца і ніколі не будуць развіты: «Таму такое ўмяшанне можа звацца яго культурай» [2, с. 477]. Так, для Г. Зімеля культура – вынік актыўнага працэсу культывацыі, а не наяўная прыродная з'ява.

У XX ст. лацінская і старажытнагрэчаская мовы вывучаліся ў школах у краінах Еўропы, адпаведна, магчымасць знаёмства з першакрыніцамі часоў Антычнасці была дастаткова высокай. У пачатку XXI ст. веданне лацінскай мовы стала экзотыкай і нагодай для здзіўлення. Неабходнасць прышчэпа на дзічку дзеля яе культывацыі таксама выклікае неразуменне ў сучасных студэнтаў, быццам батаніка з'яўляецца канчаткова выключанай са школьнай праграмы.

Аўтар артыкула імкнецца паказаць магчымасць пераасэнсавання слова «культура» ў межах культуралогіі як дзеяслова ў адпаведнасці з антычнымі поглядамі.

Дадзенае даследаванне з'яўляецца амбіцыйнай спробай разгледзець магчымасць выкарыстання граматычнай метафары ў сэнсе разумення культуры як дзеяслова замест ужо звыклага назоўніка. Каб пазбегнуць непаразуменняў, варта адразу падкрэсліць, што артыкул не ставіць перад сабой мэту аднесці назоўнік «культура» да дзеясловаў. Аднак граматычная метафара «культура як дзеяслоў» дазваляе па-іншаму паглядзець на магчымыя падыходы да вызначэння культуры: перайсці ад статыкі да дзейнасці, ад спадчыны да сучасных працэсаў, ад артэфактаў да практыкі іх стварэння.

Разгледжваюцца не часціны мовы, а магчымасць пераасэнсавання асобнага аб'екта даследавання ў межах культуралогіі як навуковай дысцыпліны. Менавіта таму тэрмін «культура» разглядаецца як назоўнік, прыметнік і дзеяслоў у кантэксце магчымых падыходаў да разумення культуры. Граматычную метафару можна разумець як метад, які запазычаны з культурнай і аналітычнай псіхалогіі: праз метафары аналітыкі імкнуцца атрымаць доступ да схаванага несвядомага. Зразумела, што адзін артыкул не здольны змяніць агульную граматычную норму, але ён можа паказаць спрэчнасць некаторых інтэрпрэтацый ці падыходаў да разумення культуры.

Асноўная частка

Для лацінскай мовы слова «культура» – аддзеяслоўны назоўнік, створаны па аналогіі з герундыем у англійскай мове: *to swim – swimming* (плаваць – плаванне). Калі звярнуцца да слоўнікаў лацінскай мовы, у іх звычайна прапануецца некалькі значэнняў слова «cultura»: 'вырошчванне', 'догляд', 'земляробства', 'адукацыя', 'развіццё', 'шанаванне'[2]. Фактычна ўсе прапанаваныя варыянты – аддзеяслоўныя назоўнікі. Так, мэтанакіраванасць дзеянняў уяўляе сабой умову для існавання культуры. Можна сказаць, што герундый быццам бы адлюстроўвае схопленае ў моманце дзеянне, якое з'яўляецца працэсам, расцягнутым у часе і прасторы, а герундый у гэтым выпадку выступае адным са шматлікіх кадраў на кінастужцы.

Культура як назоўнік. Як вядома з часоў Антычнасці, называць рэчы сваімі імёнамі – самае галоўнае і складанае дзеянне ў чалавечым жыцці. У гэтым кантэксце саму культуру можна таксама разглядаць як назоўнік. Так, культура можа быць інтэрпрэтавана як сукупнасць артэфактаў, а не дынамічных стасункаў ці ўзаемадзеянняў з імі. Такое разуменне можна разглядаць як наступства культуралагічнага падыходу, калі трэба растлумачыць культуру як з'яву, але пры гэтым не надта апеляваць да індывідуальных адметнасцей. Менавіта культуралогія, як і антрапалогія, падчас станаўлення была схільнай да вонкавага апісання культуры пры дэманстратыўным неразуменні вывучаемага феномена. Антраполагі не адразу прыйшлі да разумення неабходнасці рэлятыўнага стаўлення да культур, калі на змену еўропацэнтрызму прыйшлі спробы знайсці разуменне замест паспешных і павярхоўных ацэначных меркаванняў, калі існуе рызыка рэдукцыі ўсёй складанасці культуры да наяўнасці нейкай сукупнасці артэфактаў.

У межах культуралогіі важнае месца адводзіцца практыкам пабудовы тыпалогіі культуры, стварэнню і разуменню тыпалагізацыі грамадства ў гістарычнай перспектыве. Аднак не толькі культуралогія цікавіцца тыпалагізацыяй. У межах сацыялогіі культуры таксама ёсць жывая зацікаўленнасць у дадзенай праблематыцы. Так, У. Л. Абушэнка ў сваім даследаванні «Тыпалагічны падыход да даследавання культуры

[1] Тут і далей пераклад наш. – *А. К.*

[2] Латинско-русский и русско-латинский словарь / сост.: А. В. Подосинов [и др.] ; под общ. ред. А. В Подосинова. 10-е изд., стер. М. : Флинта, 2022. 744 с.

ў культурсацыялогіі» [3, с. 199] прапануе дзесяць існуючых падыходаў да тыпалагізацыі культуры на працягу XIX–XX стст. Замест падрабязнага пераказу падыходаў, якія былі прапанаваны аўтарам, мы зробім спасылку на схематычную версію (гл. малюнак).



Схема тыпалагічнага падыходу да вывучэння культуры
A scheme of a typological approach to studying culture

Зразумела, што кожны з прапанаваных падыходаў не з'яўляецца ў чыстым выглядзе, а абавязкова ўтрымлівае элементы іншых. Тым не менш, у кожным з іх магчыма знайсці тое, што У. Л. Абушэнка называе «"цвёрдым ядром" таго ці іншага падыходу – змястоўна бедную сістэму прэсупазіцый, якая мае дастатковую распазнавальную сілу, свайго роду прынятыя аксіяматычныя сцвярджэнні» [3, с. 190].

Асабліва цікава, што апісаныя падыходы да тыпалагізацыі культуры непасрэдна падзяляюцца на тыя, якія разглядаюць культуру як назоўнік, і тыя, якія звязаны з дынамікай і апісваюць культуру як нешта, што ўладкавана і працуе. Апошнія звязаны з працэсам, а не станам: гэта ўсё тое, што звычайна адносіцца да дзеясловаў.

Працягваючы ідэю У. Л. Абушэнкі, адзначым, што менавіта тыя падыходы да тыпалагізацыі культуры, якія засяроджваюць сваю ўвагу на дзеянні і імкнуцца ўлічваць дынаміку, з'яўляюцца найбольш распаўсюджанымі на дадзены момант. Безумоўна, яны не абавязкова з'яўляюцца больш дакладнымі ці лепшымі, аднак маюць большы эўрыстычны патэнцыял для разумення і вывучэння культуры як сацыяльнай з'явы. Выказванне пацвярджаецца тым, што гэтыя дынамічныя тыпалогіі ўлічваюць зменлівыя абставіны існавання культуры, а не абмяжоўваюцца выключна аксіялагічнымі нормамі і статычным наборам артэфактаў, сакральных тэкстаў, сімвалаў у шырокім сэнсе.

Тыпалагізацыя на падставе тэхналогій ствараецца праз адметнасці іх выкарыстання. Напрыклад, тэлебачанне распаўсюджана па ўсім свеце, аднак у кожным грамадстве гэта тэхналогія мае лакальныя адметнасці выкарыстання. Гульнявыя канцэпцыі культуры, як і тыпалагізацыі, абмяжоўваюць абшары дазволенага для інсцэніроўкі ці разыгрывання. Кожная культура імкнецца самастойна вызначыць межы дазволенага. Камунікатыўныя падыходы да тыпалагізацыі разглядаюць культуру як сукупнасць шматслойных паведамленняў і асяродак, у якім адбываецца ўзаемадзеянне і абмен паведамленнямі. Дзейнасць як крытэрый для тыпалагізацыі – гэта сукупнасць падыходаў, якія дапамагаюць звярнуць увагу не столькі на тое, чым з'яўляецца ці як вызначаецца культура, колькі на тое, што культура можа зрабіць з асобай. Дакладней, як трансфармуецца індывід пры стварэнні асобы падчас сацыялізацыі. Увага звяртаецца на ўвесь спектр магчымых трансфармацый асобы: не толькі станоўчыя, але і разбуральныя.

Культура як прыметнік. Стаўленне да культуры як да прыметніка варта разглядаць як паказчык цывілізаванасці ці дасягнення адпаведнага ўзроўню ў развіцці культуры. Можна сказаць, што гэта з'яўляецца пераходным этапам яе разумення. Культура як прыметнік адсылае да наяўнасці і засвоенасці адпаведных нормаў і правілаў. Таксама дадзенае паняцце ўпісваецца ў разуменне адрозненняў паміж культурай і цывілізацыяй – класічную для культуралогіі тэму, калі цывілізацыя выступае адным з этапаў у развіцці культуры. Цывілізацыя не абавязкова з'яўляецца выніковым этапам і прадстае як акасцянелая форма культуры, якая губляе магчымасць для трансфармацыі.

З падачы антраполагаў з'явілася акадэмічнае вызначэнне «прымітыўныя» для нееўрапейскіх культур, якія не маюць пісьменнасці. Наяўнасць і выкарыстанне найбольш новых тэхналогій з'яўляецца паказчыкам развіцця культуры: ад прыручэння агню да кнігадрукавання ці электрычнасці. Але падобнае выкарыстанне прыметнікаў нічога не сведчыць пра разуменне працэсаў змены ці таго, якім чынам наяўныя тэхналогіі выкарыстоўваюцца. Людзям дастаткова таго, што тэхналогіі проста ёсць.

Культура як прыметнік разглядаецца як паказчык узроўню развіцця грамадства, шматмернасці супольнасцей і складаных стасункаў паміж асобамі і групамі. Кажуць, што праца зрабіла з малпы чалавека, але толькі канкрэтны ўзровень развіцця культуры стварае разуменне неабходнасці распрацоўваць праграмы навучання і экзамены па ахове працы.

Разуменне неабходнасці дакладнага выканання патрабаванняў тэхналогіі забяспечвае той высокі ўзровень якасці, які называецца культурай працы.

Можна канстатаваць наяўнасць разрыву ў разуменні таго, чым з'яўляецца культура для ўсіх, хто актыўна выкарыстоўвае тэрмін «культура як прыметнік». Класічным прыкладам культуры як прыметніка будзе этыкет паводзін за сталом. Ёсць культуры, дзе абыходзяцца толькі рукамі, ёсць тыя, дзе выкарыстоўваюць палачкі, і разам з імі ёсць тыя, дзе існуе складаная сістэма выкарыстання нажоў, відэльцаў і лыжак разнастайных форм і памераў. І тут узнікае пытанне, што будзе паказчыкам культурнасці: выключна засваенне складанай еўрапейскай сістэмы паводзін за сталом ці здольнасць адаптавацца да патрабаванняў іншых традыцый і нормаў? Дадзенае пытанне з'яўляецца адкрытым, як і пытанні пра змястоўнае напаўненне канцэпцыі культурнага адпачынку з барбекю на прыродзе і пра тое, чым ён мусіць адрозніваецца ад дзікунскіх рытуалаў вакол вогнішча.

Культура як дзеяслоў. Калі чалавек адмовіцца ад штучнага абмежавання разумення культуры як фіксаванай, але каштоўнай спадчыны, узнікне патрэба перагледзець уяўленні пра культуру як пра працэс ці дзеянне. У такім кантэксце мае сэнс не апісанне нейкай з'явы, а разгляданне яе наступстваў. Сцвярджэнне «культура як вынік культывацыі» гучыць таўталагічна, але толькі пры разглядзе культуры як стану, а не працэсу. Статычны падыход прадугледжвае працу з культурнай спадчынай, з тым, што засталося ад папярэднікаў і ніяк не можа быць зменена. У такім выпадку магчымасці развіцця культуры з'яўляюцца неадназначнымі. Рзуменне культуры як працэсу азначае, што вынік дзеянняў яшчэ дакладна не вядомы. Зразумела, што ёсць чаканні і надзеі, але дакладна няма гарантый на атрыманне таго ці іншага выніку. Як адзначае Б. В. Стрыт, «культура – гэта актыўны працэс стварэння сэнсу і спрэчкі за вызначэнне, у тым ліку за ўласнае вызначэнне» [4, p. 25], што дазваляе разважаць пра культуру як дзейнасць ці дзеяслоў.

Калі разглядаць культуру як карту агульных сэнсаў, яна паўстае адкрытай сістэмай. Агульныя сэнсы могуць змяняцца, дапаўняцца, ператварацца ў іншыя падчас трансфармацыі культуры. Для культурнай антрапалогіі прызнаецца магчымасць існавання рэальнай аўтэнтычнай культуры, з якой і пачынаюцца ўсе адрозненні паміж астатнімі. Для сацыяльнага канструктывізму сістэма іншая: усе сэнсы з'яўляюцца вынікам канвенцый, якія ўзнікаюць падчас узаемадзеянняў паміж сацыяльнымі суб'ектамі. Напэўна, тут можна прывесці прыклад пабудовы культурнай ідэнтычнасці выключна вакол рытуальнага выкарыстання мовы, ігнаруючы складаны і шматузроўневы характар эканамічных, палітычных і сацыяльных умоў існавання той ці іншай культуры. Калі прадстаўнікі аднаго этнасу падобным чынам успрымаюць сэнс агульных культурных кодаў, то гэта значыць, што яны маюць доступ да «карты ментальных канцэптаў», і гэта з'яўляецца не праблемай перакладу ці ступені дасканаласці ў разуменні мовы, а тым, што застаецца недаступным для перакладу, бо з'яўляецца лакальным кантэкстам, бясконцым ланцужком дзеянняў і адсылак да культурнай спадчыны. Для разумення такіх выразаў недастаткова проста вывучыць мову, неабходна вырасці ў дадзенай культуры. Акрамя таго, калі антраполагі бачаць на свае ўласныя вочы, што адбываецца, наўрад яны разумеюць сэнс гэтых дзеянняў, асабліва калі размова ідзе пра рытуалы. Сэнс таго, што адбываецца, заўсёды мае сімвалічны, а не практычны характар. Антраполагі могуць дакладна задакументаваць і апісаць, што адбываецца, але не зразумець гэтага. Для інтэрпрэтацыі будуць неабходны дадатковыя намаганні і адмысловая знакавая сістэма, у якасці якой часцей за ўсё выступае мова. І мова апісання культуры мае прынцыповае значэнне для канструявання сэнсаў і тых самых падзяляемых канцэптаў і сімвалаў.

Культурная антрапалогія вывучае культуру, што можа быць зведзена да разумення эфектыўнага ўзаемадзеяння ў спецыфічным асяроддзі. Сацыяльная антрапалогія даследуе сацыяльную арганізацыю і паводзіны, а таксама іх узаемадачыненні. Але назіранне за інфармантамі не дае магчымасці атрымаць непасрэдны доступ да культуры, паколькі яно заўсёды накіравана на паводзіны і ўзаемадзеянне людзей, якія з'яўляюцца носьбітамі культуры. Мы вывучаем дзеянні, але потым спрабуем зрабіць высновы адносна стану культуры. Так адбываецца пераход ад дзеянняў да стану культуры. Мы маем справу з рэпрэзентацыяй дзеянняў, а не з самімі дзеяннямі, што адкрывае магчымасці для стварэння семіятычнага разумення культуры як тэксту. Відавочна, што лінгвістычны складнік тут адыгрывае істотную ролю і пачынае падмяняць сабой усе іншыя формы дзеяння. Зразумела, што ў выніку моўнай дзейнасці ствараюцца рэпрэзентацыі культуры, але яна не з'яўляецца адзінай. Магчыма, што падобны тэкстуальны паварот у разуменні культуры ў некаторым сэнсе спрыяе папулярызацыі рэіфікацыі культуры, калі яна ўспрымаецца як аб'ект, стан, здабытак, а не працэс: «Фармалізацыя мовы служыць для канструявання культуры: менавіта яна надае бачную фіксаванасць, адзінства і нормы розным групам людзей на месцах» [4, p. 29]. Фармалізацыя мовы не даказвае наяўнасць аўтэнтычнай культуры, якая застаецца нязменнай. Культура з'яўляецца працэсам, а не акамянелым вынікам. Калі яе неабходна засвоіць падчас сацыялізацыі, то як вызначыцца з памерам абавязковага мінімуму для эфектыўнага ўзаемадзеяння і жыцця ў межах гэтай культуры? У якім выглядзе і дзе захоўваецца гэты абавязковы

для засваення мінімум? Веданне мовы на ўзроўні B2 ці C1? Засваенне праграмы сярэдняй школы? Гэты пералік пытанняў магчыма працягваць бясконца, напэўна, таму што сацыялізацыя, як працэс «уваходжання» ў культуру, можа забяспечыць чалавека навыкамі, якія дазваляюць далей вучыцца, атрымліваць неабходную для выжывання інфармацыю. У розных культурах навыкі прынцыпова адрозніваюцца (ад магчымасці дамаўляцца з духамі продкаў да здольнасці фармуляваць рэлевантны запыт для штучнага інтэлекту).

Такім чынам, культуру можна разглядаць як рэсурс, які не належыць выключна нейкай адной сацыяльнай групе ці індывіду. Па аналогіі з паветрам ці сонечным святлом, якія існуюць для ўсіх, як і культура. Але кожная культура стварае межы (яны могуць мець розны характар, напрыклад, сацыяльны, этнічны, расавы, узроставы, адукацыйны і інш.), падзяляючы людзей на «сваіх» і «чужых». Калі чалавек пераходзіць праз гэтыя межы, ён вымушаны адаптавацца да новых правілаў і ўмоў дзейнасці. І гэта становішча з неабходнасцю адаптацыі ўласных дзеянняў падводзіць нас да пытання, ці магчыма засвоіць культуру без мовы і мову без культуры. Гаворка ізде аб засваенні культуры на нелінгвістычным узроўні (патэрны паводзін, эмацыйнасць, сацыяльныя ролі і інш.). Асобнае месца тут займае навучанне лакальным традыцыйным рамёствам, калі тэарэтычны падмурак не патрэбен, а неабходна засвоіць правільныя тэхнікі цела (ад палявання з лукам да касьбы), маецца на ўвазе не тэорыя і прыгожыя словы, а самі дзеянні. Аднак засваенне культуры не абмяжоўваецца вывучэннем мовы, бо існуе шэраг працэсаў, якія маюць больш шырокі характар. Падчас адукацыйнага працэсу «мы таксама перадаём часта схаваныя культурныя веды пра тое, што значыць чытаць і пісаць у пэўнай культуры» [4, p. 42]. Але часам гэта дзейнасць у межах адпаведнай культуры можа быць рэдукавана да статычных аб'ектаў: «Культура – гэта не рэч, але яна павінна быць упакавана як рэч у сацыяльным навуковым дыскурсе, каб быць прыдатнай для вызначэння» [4, p. 42]. Натуральна, што больш проста зрабіць вынік, чым апісваць працэс. Калі мова выконвае функцыі структуры культуры, ці не адбываецца падмена вывучэння культуры праз вывучэнне мовы? Засваенне культуры як дзейнасці цалкам магчыма без пасярэдніцтва мовы, дзякуючы «нелінгвістычным асаблівасцям нашых культурных ведаў» [4, p. 43]. Гаворка ідзе пра тыя самыя тэхнікі цела і веды на кончыках пальцаў: калі мы ведаем, як нешта зрабіць, але не можам гэтага растлумачыць, бо «вочы баяцца, а рукі робяць».

Так паўстае новае, яшчэ больш складанае пытанне адносна культуры як дзеяслова: ці любое дзеянне з'яўляецца культурным? Хіба не кожнае дзеянне суправаджаецца маральна-этычнымі пытаннямі і з'яўляецца праяўленнем волі асобы? Шмат што з нашых штодзённых дзеянняў наўпрост можа быць звязана з біялогіяй ці хіміяй і абгрунтавана імі. Напэўна, уключэнне разважанняў пра практыку і праксіс, якія доўжацца з часоў Арыстоцеля да цяперашняга часу, здольна ўнесці праўкі ў разуменне культуры як дзеяслова. Чалавек з'яўляецца не адзінай істотай, якая прыдатна да актыўных аўтаномных дзеянняў, аднак «дзейнасць да і па-за каштоўнасным меркаваннем не з'яўляецца дзеяннем, якое адрознівае чалавечую форму актыўнасці ад іншых формаў жыцця ў космасе» [5, с. 73]. Дзейнасць рэгулюецца аксіялагічнымі нормамі ці ўнутраным маральным законам і дазваляе разважаць пра існаванне асобы, якая клапаціцца пра канструяванне ўласнай ідэнтычнасці праз дзейнасць у сферы культуры. Кожны зварот да культуры з'яўляецца не апісаннем нейкай рэчы ці з'явы, а дзеяннем, што звязана з пэўнымі рэчамі ці з'явамі, якія маюць сэнс і ўплываюць на ідэнтычнасць. Творчасць у дзеяннях асабліва істотна тады, калі назіраецца перакрыжаванне ідэнтычнасцей і кожны чалавек можа мець больш чым адну дакладна вызначаную ідэнтычнасць.

Сучасныя інтэрпрэтацыі каштоўнасці ці значнасці маральных дзеянняў індывіда пераносяцца з унутранага абавязку асобы на знешняе прызнанне праз меркаванні і ацэнкі іншых людзей, не абавязкова экспертаў. Папулярызацыя пункту гледжання Г. Лотцэ адносна практычнай дзейнасці вядзе да таго, што «паступова губляецца спрадвечны сэнс праксісу як самадастатковага дзеяння дабрадзейнага жыцця, які паддаецца засваенню практычнай філасофіяй толькі ў той меры, у якой яна ператвараецца ў дзейнае жыццё добрасумленнага грамадзяніна поліса» [5, с. 74].

Высновы

Выкарыстанне граматычнай метафары «культура як дзеяслоў» дазволіла зрабіць некалькі цікавых назіранняў адносна пытанняў культурнай ідэнтычнасці і практычнай дзейнасці. Далёка не кожнае фізічнае дзеянне чалавека з'яўляецца культурным. Культурнае дзеянне робіцца пад уплывам каштоўнасных меркаванняў. Культура як дзеяслоў уяўляе сабой феномен пошуку тлумачэння ўласных дзеянняў: ад складаных рытуалаў да штодзённай руціны. Ідэнтычнасць выступае не ступенню адпаведнасці самому сабе ці нейкім нарматыўным узорам у мінулым, а паслядоўнай серыяй адказаў на шырокі спектр пытанняў. Культурная ідэнтычнасць – гэта працэс, які актуалізуе практыкі прыналежнасці да адпаведнай культуры, сцвярджаючы яе каштоўнасць не словамі, не думкамі, не эмацыйнымі хваляваннямі,

а менавіта праз практычную дзейнасць, што мае дадатковую каштоўнасць і здольна сканструяваць уласную ідэнтычнасць.

Магчыма, што прадстаўленае даследаванне не з'яўляецца радыкальна новым у сваёй спробе пераасэнсаваць азначэнне і разуменне культуры. Даследчыкі сацыялогіі культуры традыцыйна звяртаюць увагу на практыку і дзейнасць рэспандэнтаў, а не абмяжоўваюцца вербальным узаемадзеяннем з імі. Культурная антрапалогія даследуе і параўноўвае практыку інфармантаў з іх наратывамі апісання гэтай самай практыкі. Магчыма, што і для культуралогіі мае сэнс не паўтараць памылак мастацтвазнаўства і не займацца рэіфікацыяй культуры, калі аб'екты ці рэчы прадстаюць больш важнымі, чым працэс іх стварэння ці практыка іх выкарыстання. Калі праца зрабіла з малпы чалавека, то што з чалавека можа зрабіць культура? Гэта пытанне можа быць разгледжана ў далейшых даследаваннях.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Катон. *Земледелие*. Сергеенко МЕ, переводчик. Москва: Академия наук СССР; 1950. 220 с.

2. Зиммель Г. О сущности культуры. В: Левит СЯ, редактор. *Избранное. Том 1, Философия культуры*. Москва: Юрист; 1996. с. 475–782.

3. Абушенко ВЛ. Типологический подход к исследованию культуры в культурсоциологии. В: Комаровский АВ, составитель. *Основания культурсоциологии: избранные труды*. Минск: Беларуская навука; 2016. с. 176–200.

4. Street BV. Culture is a verb: anthropological aspects of language and cultural process. In: Graddol D, Thompson L, Byram M, editors. *Language and culture. Papers from the annual meeting of the British Association of Applied Linguistics; 1991 September; Durham, United Kingdom*. [S. l.]: British Association of Applied Linguistics; 1993. p. 23–43.

5. Мацевич-Духан ИЯ. Праксис и практика: способы различения. *Философские науки*. 2021;64(3):50–79.

Артыкул паступіў у рэдкалегію 29.01.2026.
Received by the editorial board 29.01.2026.